калегіума (1631—33), прапаведнік у Варшаве, рэктар Полацкага калегіума (1650—53), спавядальнік падканцлера ВКЛ К.Л.Сапегі ў яго вайсковых абозах (1653—54), рэктар Нясвіжскага калегіума (1670—73), місіянер у Тыкоціне. Аўтар пахавальнага казання «Мемарыял бессмяротнай памяці...» (Вільня, 1667) пра жыццё К.Л.Сапегі. У ім змешчаны партрэты і гербы прадстаўнікоў роду Сапегаў. Яго тэалагічны твор «Гарчычнае зерне горкай пакуты...» (Вільня, 1673) карыстаўся вял. папулярнасцю, неаднаразова перавыдаваўся (Вільня, 1688, 1757; Замосце, 1701; Каліш, 1746, 1756; Кракаў, 1881); у 1719 перакладзены на ням. мову (Рэгенсбург).

*В.С.Пазднякоў.*

**АНДРАЮ́К** Серафім Антонавіч (н. 10.3.1933, в. Градзялі Падляскага ваяв., Польшча), беларускі крытык, літаратуразнавец. Засл. работнік культуры Беларусі (1993). Канд. філал. навук (1966). Скончыў БДУ (1957). Настаўнічаў. У 1966—81 і 1999—2008 навук. супрацоўнік Ін-та мовы і л-ры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. З 1981 гал. рэд., у 1993—97 дырэктар выд-ва «Мастацкая літаратура». Даследуе гісторыю бел. л-ры, сучасны літ. працэс. Аўтар манаграфій «Жыццё. Літаратура. Героі» (1973), «Традыцыі і сучаснасць» (1981), зб-каў крыт. артыкулаў «Вывяраючы жыццём» (1976), «Жыць чалавекам» (1983), «Чалавек на зямлі: нарыс творчасці І.Пташнікава» (1988), «Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку» (2008). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1977, на рус. мове), «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» (т. 1—4, 1999—2003).

*Тв.*: Стыль пісьменніка. Мінск, 1974; А жыццё — вышэй за ўсё: выбранае. Мінск, 1992; Пісьменнікі. Кнігі. Мінск, 1997.

*І.М.Гоўдзіч.*

**АНДРО́СІК** Андрэй Фёдаравіч (13.7. 1941, г. Самара, Расія — 3.2.2003), беларускі рэжысёр. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965), Ленінградскі ін-т тэатра, музыкі і кінематаграфіі (1972). З 1971 рэжысёр Нац. акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы, з 1995 маст. кіраўнік Бел. рэсп. тэатра юнага гледача. Для яго рэжысуры характэрны тэатр. відовішчнасць, тонкае раскрыццё псіхалогіі герояў. Сярод пастановак: «Беласнежка і сем гномаў» Л.Усцінава і А.Табакова (1971), «Шрамы» Я.Шабана (1977), «Апошні журавель» А.Дударава і А.Жука (1986, з В.Раеўскім) у тэатры імя Я.Купалы. «Маленькі лорд Фаўнтлерой» М.Воранава паводле Ф.Бёрнет (1998), «Палачанка» А.Дударава (2000), «Паліяна» паводле Э.Портэр (2003) у тэатры юнага гледача і інш.

*С.Андруховіч. Эскіз да карціны «Пасля работы. Гутарка агітатара». 1953.*



**АНДРУХОВІЧ** Сцяпан Адамавіч (1.1. 1909, в. Губіна Уздзенскага р-на — 5.4.1989), беларускі жывапісец. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930). Працаваў у станковым жывапісе пераважна ў тэматычнай карціне. Сярод твораў: «Арышт бальшавікоўпадпольшчыкаў» (1940), «Веснавая сяўба», «Жыта» (абодва 1947), «Коні. На лузе», «Пасля работы. Гутарка агітатара» (абодва 1953), «Мінскае мора» (1954), «Калгасны табун» (1958), «Новалукомль» (1966), «Кар'ер» (1967), «Пейзаж з лодкай», «Зіма» (абодва 1973), «Перад дажджом» (1975), «Пейзаж з конямі», партрэт Я.Купалы (абодва 1979) і інш.

**АНДРУШЭВІЧ** Ян [пач. 16 ст. — 1567(?)], рэлігійны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ; паэт-лацініст. Займаў пасады каноніка ў Вільні, біскупа ў Кіеве і Луцку, актыўна ўдзельнічаў у грамадска-паліт. жыцці як дзеяч Контрэрфармацыі. Каля 1543 напісаў элегічным двухвершам дыдактычна-рэліг. паэму («Lens Lituana olim...», 52 радкі) пра легендарнае забойства ў Вільні 14 францысканскіх манахаў у перыяд княжання Альгерда [1345—77]. Гал. змест і пафас паэмы ў апалагетычна-хрысціянскай тэндэнцыйнасці, дыдактызме, асуджэнні братазабойстваў. Паэма была выбіта на адным з помнікаў у гонар францысканскіх місіянераў, упершыню апублікавана Л.Вадзінгам у «Annales minorum» («Малыя аналы», выходзілі ў 1588—1657). Перакладзена на польск. і літоўскую мовы.

*Літ.*: Д о р о ш е в и ч В.И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы: первая половина XVI в. Минск, 1979.

**АНДРЫЁЛІ** Міхал Эльвіра (26.11.1837, Вільня — 23.8.1893), жывапісец, рысавальшчык, ілюстратар. Вучыўся ў